**Сумко Алена Вячаславаўна**
Полацкі дзяржаўны ўніверсітэт имя Еўфрасінні Полацкай
e-mail: e.sumko@psu.by

## ЯЎРЭЙСКІЯ ГАНДЛЯРЫ ВАЧЫМА БЕЛАРУСКІХ ВЯСКОЎЦАЎ (ПА ФАЛЬКЛОРНЫХ МАТЭРЫЯЛАХ БЕЛАРУСКАГА ПАДЗВІННЯ)[1]

***Анатацыя.*** Разглядаецца вобраз яўрэя-гандляра ў фальклорнай традыцыі вясковага насельніцтва. У якасці крыніц выступілі палявыя экспедыцыйныя матэрыялы, зафіксаваныя на тэрыторыі Беларускага Падзвіння ў 2000-х гадах.

***Ключавыя словы:*** гандаль, Беларускае Падзвінне, вяскоўцы, яўрэі.

**Alena Sumko**
Euphrosyne Polotskaya State University of Polotsk
e-mail: e.sumko@psu.by

## JEWISH TRADERS IN THE EYES OF BELARUSIAN VILLAGERS (ON FOLK MATERIALS OF THE BELARUSIAN PODVINYE)

***Abstract.*** The image of a Jewish merchant in the folklore tradition of the village population is considered. The sources were field expedition materials recorded on the territory of the Belarusian Podvinye in the 2000s.

***Keywords:*** trade, Belarusian Podvinye, villagers, Jews.

У фальклорнай традыцыі вяскоўцаў гандаль супрацьпастаўляўся земляробству, але разам з тым ён быў неабходным для паўнавартага функцыянавання вясковага соцыуму. У калектыўнай памяці вясковага насельніцтва гандлёвыя і абменныя аперацыі, перш за ўсё міжваеннага перыяду, звязваліся са сферай дзейнасці пераважна яўрэйскага насельніцтва. “[На зямлі не робілі?] *Не, гэта не яўрэйскае, гэта не іхная спецыяльнасць, яны вот тут, там..таргуюць там чым*” (Глыбоцкі р-н) [1]; “Да ну што яўрэі людзі былі граматныя, хітрыя, робіць не хацелі, і яны на зямлі не работалі. Яны, вот як цяпер на базарах, таргуюць яны, і ўсё” (Докшыцкі р-н) [2, с. 352]. Сапраўды, асабліва ў гарадах і мястэчках, гандлярамі былі з большага яўрэі. Паказальнымі з’яўляюцца даныя па г. Лепель, дзе ў “пачатку 1920-х гг. каля 85% працаздольнага габрэйскага насельніцтва займалася дробным гандлем, астатнія 15% сумяшчалі гандаль з рамеснай дзейнасцю” [3, с. 19]. Прыблізна такая ж карціна фіксуецца ва ўспамінах пра даваенны час і ў мястэчках

[1] Артыкул падрыхтаваны ў рамках навуковай тэмы ГБ 1321 «Этнічныя вобразы ў фальклорнай традыцыі беларусаў Падзвіння XIX – пачатку XXI ст.: тыпалогія і ўзроўні рэпрэзентацыі на ўсходнееўрапейскім фоне».

Заходняй Беларусі: “А яўрэяў многа было, цэлыя Дунілавічы. Магазіны бальшыя былі, таргавалі. Там і булачкі свае яны пяклі. Такі хлеб быў харошы. Яны як спякуць, дык ідзеш праз Дунілавічы, дык пахніць, знаць што хлеб. Сільна харошы хлеб рабілі” [2, с. 350]; “*Вот, і гаварат жа яўрэйскі горад Дзісна. Тут усё, каждый, што дом, то яўрэй.*”[4].

Палявыя матэрыялы сведчаць, што яўрэйскія гандляры былі спецыялістамі ў сваёй справе і вельмі добра адчувалі, што хоча пакупнік, нават, калі ён сам не мог дакладна патлумачыць пра мэту звароту: “*…прышоў, я ж з дзярэўні, бацька капеек сколькі даў, яму хацелася піджачок купіць, прышоў і гаварыць: “Кулік мне”. Кулік – называлі гэты педжачок (гэта ў дзярэўні кулік, гэта піджак у дзярэўні так называлі). А яўрэй усё панімаець і тады гаворыць: “Мальчык, піджак, ёсць у меня, хадзі, я цябе памераю”. А ён не знаў, как у яўрэя спрасіць*” [4].

Ва ўспамінах насельніцтва Падзвіння фіксуецца спецыфіка гандлёвых аперацый у межах вясковай грамады, а менавіта іх персаналізаваны характар. Асабістыя стасункі пакупніка з прадаўцом маглі ўплываць на форму аплаты за тавар. Некаторыя рэспандэнты, пераважна з заходніх раёнаў, якія ў міжваенны час уваходзілі ў склад Польшчы, узгадвалі пра тое, што калі ў вяскоўца не было грошаў, то, улічваючы ўзровень знаёмства з гандляром-яўрэем, можна было разлічыцца нейкімі паслугамі. “*Плацілі там, як дагаварацца. Еслі была вазможнасць – грашмі, а не, дык ён і тожа браў, ну чым-небудзь ілі там яму хто памог – парработаць. Атец быў такі, як гаварацца рукаты, ён мог і плотнічаць, і сапожнічаць, ён усё мог. В гэтым разбіраліся*” (Глыбоцкі р-н) [1]. Акрамя гэтага, ва ўспамінах ўзгадваецца сюжэт пра тое, што на падставе асабістага даверу гандляр, улічваючы адмысловае матэрыяльнае становішча пакупніка, неабходныя тавары ці прадукты харчавання, мог даваць “на павер” – у доўг: “[Ну, а на павер давалі? Вот як пазыку?] *Дадуць, як знакомы*. *Запішуць, а ты паслі аддасі*” (Глыбоцкі р-н) [1]; “*Вот баця мой паедець у Дзісну, там што прадасць: картошкі там авечку ці што, ну нада ж было і ў іх возьме. Дажа можна і на павер было, каго яны знали яны давалі і на павер, матерыялы усякія*” (Міёрскі р-н) [4]; “*Яўрэі яны таргавалі. Каторыя бедныя пойдуць, яны всегда выручалі – давалі ў долг. Дажэ прыдлагалі. Каторыя заробяць, тады аддаюць ім*” (Браслаўскі р-н) [5]; “Ай, дарага”. – “Снімаю, дзішэўле”. – “Ай, дзенег нет”. – “Ай, ты знакомы, запішу” (Пастаўскі р-н) [2, с. 349].

Улічваючы абмежаваную пакупную здольнасць сялян, іншы раз тагачасныя гандлёва-абменныя аперацыі будаваліся на ўзаемавыгадных умовах, што сведчыла пра гнуткасць камерцыйных схем і здольнасць гандляра-яўрэя падладжвацца пад пэўныя ўмовы. Распаўсюджаным быў абмен прамысловых тавараў на прадукты з асабістай гаспадаркі вяскоўца: “У іх былі лавачкі. Вот баба наша расказавала. Цяпер жа вот зберым ці масла, ці што і на базар за грошы прадаём. Раньшэ ж баба тожа, дзве дачкі ў яе было, і нада ж было хусцінкі тыя, ці што. Масла

саб’ець, тамака хунтамі звалі, ні кілаграмамі, а хунт – гэта чатырыста грам. І панясець у горад. Тамака, Моська зваўся, у яго была нейкая свая, ларок як цяпер. Ну во, гэтаму Моську масла, а ён тамака ці два метры, як на куртачку, сітцу” (Лепельскі р-н) [2, с. 348].

Матэрыялы этнаграфічных экспедыцый паказваюць, што стаўленне да яўрэйскага гандляра з боку вясковага насельніцтва было дваістым. З аднаго боку, яго паважалі за дабразычлівасць і тактоўнасць у гандлёвых аперацыях, а таксама за магчымасць прадастаўленне крэдыту на падставе асабістага даверу: “*Яўрэі дужа добра да людзей атнасіліся. Прадавалі, і мама казала, еслі ў цябе няма наразе, магазінаў многа было адкрытых у іх, ну, яны таргавалі там, дык дадут табе і напавер, гэта з магазіна: “Ты после аддасі нам”. Мама і тата хвалілі*” [4]. З другога боку, яўрэй, паводле этнічных, канфесійных, культурна-побытавых прыкмет успрымаўся як “чужынец”, і яму прыпісваліся адмоўныя характарыстыкі [6, с. 72]. У вуснай традыцыі Беларускага Падзвіння сустракаецца вобраз “хітрага яўрэя”, што не ў апошнюю чаргу было звязана са спецыфікай вядзення гандлёвых аперацый. “Хітрасць” праяўлялася ў тым, што гандляр-яўрэй спецыяльна завышаў цану на нейкі тавар, каб потым, зрабіўшы выгляд, што саступае, прадаць па аптымальным кошце для сябе: “*Вот помню, прыехалі мы з бацькам у гэты ў магазін у прадуктова-ягадны магазін. “Ну, пан, што табе? Вот гэта та стока та стоіць, гэта стока та..”. “А не дорага. Мне нада на гасцінец, што ну дяшовей”. “Ну стока та…” Гэта нада старгавацца з ім, а яны дарагі запрос беруць, ну а тады ўжо аддаюць каму што. Вот такая – абманкі былі.*” [4]. Разам з тым, неабходна адзначыць, што незалежна ад стаўлення да яўрэйскага гандляра, пераважная большасць рэспандэнтаў адзначала, што яўрэі – разумныя і кемлівыя: “*Яны сільна умныя былі. Дзе яўрэй ёсць там ужо не прападзёж*” [4].

Неабходна канстатаваць, што характарыстыка вобраза яўрэйскага гандляра ў сучасных этнаграфічных матэрыялах з большага складаецца праз трансляцыю аповядаў бацькоў рэспандэнтаў (большасць рэспандэнтаў – жанчыны, якія нарадзіліся ў канцы 1920-х – 1930-х гг.), а не на падставе асабістага вопыту ўзаемадзеяння. Падзеі Вялікай Айчыннай вайны, якія прывялі да знішчэння яўрэйскага насельніцтва, а таксама адрозная ад рэалій Заходняй Беларусі міжваеннага часу мадэль савецкага гандлю, прывялі да таго, што яўрэй-гандляр, як пастаянны і актыўны ўдзельнік гандлёва-абменных аперацый, фактычна знікае з штодзённасці вясковага соцыўма.

## СПІС ЛІТАРАТУРЫ


1. Матэрыялы этнаграфічнай экспедыцыі ў Глыбоцкі раён, май 2019 г.
2. Полацкі этнаграфічны зборнік. Вып. 2. Народная проза беларусаў Падзвіння: у 2 ч. / уклад., прадм. і паказ. У. А. Лобача. – Наваполацк : ПДУ, 2011. – Ч. 2. – 368 с.

3. Карпекин, К. «Они жили в этом городе…» : Очерки истории лепельских евреев в 1840–1930-е гг. / К. Карпекин // Лепель: память о еврейском местечке / Отв. ред. С. Амосова. – М. : Центр “Сэфер”, Ин-т славяноведения РАН, 2015. – 496 с.
4. Матэрыялы этнаграфічнай экспедыцыі ў Міёрскі раён, ліпень 2019 г.
5. Матэрыялы этнаграфічнай экспедыцыі ў Браслаўскі раён, ліпень 2021 г.
6. Лобач, У. А. Вобраз габрэя-гандляра ў традыцыйнай карціне свету беларусаў Віцебшчыны канца XIX – першай паловы XX ст. / У. А. Лобач // Працы Цэнтра вывучэння гісторыі гандлю. – Вып. 2. – Мінск : ТАА Інстытут рознічных тэхналогій “Менка”, 2017. – С.72–79.